

АД СУПЕР-
КАМП'ЮТАРАЎ
ДА КОСМАСУ



І СЛЁЗЫ,
І РАДАСЦЬ

21

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛІПЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 124 (29493)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

## БЫЦЬ ГАСПАДАРАМІ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ

*Дарагія суайчыннікі!*

*Ад усёй душы віншую вас з Днём Незалежнасці.*

*Галоўнае свята краіны ўвасабляе шматвяковую гісторыю барацьбы беларусаў за свабоду, за права жыць на роднай зямлі.*

*Глыбока сімвалічна, што гэтая дата гістарычна звязана з днём вызвалення сталіцы нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ заплаціў мільёнамі жыццяў сваіх сыноў і дачок, абараняючы нашу будучыню. Гэты горкі вопыт навучыў нас берагчы мір, цаніць нацыянальнае адзінства, змагацца за дзяржаўнасць.*

*Беларусы заўсёды чэрпалі сілы ў духоўнай спадчыне продкаў, у іх працавітасці і самаадданасці. За намі стаяць многія пакаленні патрыётаў, стваральнікаў, пераможцаў. Мы не маем права іх падвесці, таксама, як мы ў адказе і перад нашымі нашчадкамі.*

*Пераканаыя, толькі беражліва захоўваючы памяць аб героях і прымнажаючы дасягнутае, беларусы заўсёды будуць заставацца гаспадарамі на сваёй зямлі і самі вызначаць уласны лёс.*

*Са святам, дарагія сябры!*

*Жадаю вам моцнага здароўя, міру і новых дасягненняў на карысць роднай Беларусі!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Абеліскі параненай зямлі



## СІМВАЛ СТОЙКАСЦІ І МУЖНАСЦІ

### Сёння цяжка ўявіць, што Курган Славы мог выглядаць інакш...

**Гэта святое для кожнага беларуса ўзвышша на 21-м кіламетры магістралі, якая вядзе з Мінска ў Маскву, цяжка праехаць або прайсці, не спыніўшыся. Мала хто ведае, што Курган Славы — гэта не проста помнік героям Вялікай Айчыннай вайны, манументальная падзяка ўдзельнікам пераможнай Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён», сімвал стойкасці і мужнасці беларускага народа. Акурат на гэтым месяцы ў пачатку ліпеня 1944 года разгарнуліся жорсткія баі за вызваленне беларускай сталіцы...**

### МІНСКІ КАЦЁЛ

Тут, дзе сёння ўзвышаецца Курган Славы, была знішчана буйная групоўка праціўніка. Гісторыкі вайны пазней назавуць гэтае месца Мінскім катлом.

— 3 ліпеня 1944 года, у дзень вызвалення Мінска, воіны 1-га і 3-га Беларускіх франтоў замкнулі кола акружэння, у выніку чаго на ўсходзе ад горада ў «кацёл» трапіла 105-тысячная групоўка праціўніка, — расказвае **старшы навуковы супрацоўнік аддзела ваенна-франтавой гісторыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Юлія КАЛТОВІЧ.** — У гранічна сціслыя тэрміны, за шэсць сутак, з 5 да 11 ліпеня, войскі 2-га Беларускага фронту і 31-й арміі 3-га Беларускага фронту раздзялілі на ізаляваныя часткі і разграмілі асноўныя сілы групы армій «Цэнтр». 70 тысяч гітлераўцаў было знішчана, 35 тысяч — трапіла ў палон, у тым ліку 12 нямецкіх генералаў.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X
21124